Конкурс творчых работ і малюнкаў **“Малая радзіма вялікіх людзей”**, прысвечаны Дню беларускага пісьменства

#Дзень_пісьменства 2021

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні творчага конкурса “Малая радзіма вялікіх людзей”

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Сапраўднае Палажэнне рэгламентуе статус і парадак правядзення творчага конкурса (далей – Конкурс), патрабаванні да ўдзельнікаў і конкурсных работ, парадак прадастаўлення работ на Конкурс, тэрмін правядзення Конкурсу дзейнічае да заканчэння Конкурсных мерапрыемстваў.

1.2 Арганізацы і правядзенне конкурсу ажыццяўляецца Дзяржаўнай ўстановай культуры “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі” пры падтрымцы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Капыльскага райвыканкама.

1.3 Інфармацыя аб правядзенні Конкурсу распаўсюджваецца праз сетку публічных бібліятэк Капыльскага раёна, размешчваецца на сайце http://kapyl.by і ў сацыяльных сетках “У кантакце”, “Інстаграм” арганізатара конкурсу.

1.4 Конкурс праводзіцца з 24 мая па 5 верасня 2021 г. Конкурсныя работы дасылаць на адрас: 223927 г. Капыль, вул. Замкавая, 1а, Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка; e-mail: kopylbibl@mail.ru, тэлефон для даведак: 55-5-33, 54-7-85.

## 2. АСНОЎНЫЯ МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца з мэтай папулярызацыі творчасці пісьменнікаў-землякоў.

Задачы:

- актывізаваць работу бібліятэк па краязнаўчай праграме “І для мяне не было б Беларусі, без маленькай Радзімы маёй”;
- павысіць узровень цікавасці да літаратуры, заахвоціць да асабістай творчай дзейнасці;

- садзейнічаць вывучэнню жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў-землякоў;
- выявіць і падтрымаць таленавітых аўтараў, мастакоў;
- выкарыстоўваць новыя інфармацыйныя тэхналогіі для мадэрнізацыі бібліятэчнага краязнаўства;

3. НАМІНАЦЫІ КОНКУРСУ

Конкурс прысвечаны жыццю і творчасці пісьменнікаў Капыльшчыны ў намінацыях:

- літаратурная творчасць "Чытай сваё": вершы, апавяданні, эсэ (аб'ём не абмежаваны)
- буктрэйлер "Галасы любімых кніг": відэаролік з прапагандай твора пісьменніка-земляка;
- выяўленчае мастацтва "Постаці слаўнага краю майго": ілюстрацыі, прысвечаныя жыццю і творчасці пісьменнікаў-землякоў: партрэт, малюнкі па матывах апавяданняў.

<u>Намінацыя</u>: літаратурная творчасць "Чытай сваё".

Прымаюцца літаратурныя творы любога напрамку, стылю, жанру, якія адлюстроўваюць асноўныя тэмы конкурсу, аб'ём не мае значэння.

Тэкст павінен быць аформлены на старонках у фармаце А4, у рэдактары WORD, шрыфт Times New Roman, інтэрвал адзінарны. Тытульны ліст з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, назву твора і жанр.

<u>Намінацыя</u>: буктрэйлер "Галасы любімых кніг".

Першы слайд павінен змяшчаць назву работы ў намінацыі. На апошнім слайдзе інфармацыя пра аўтара (прозвішча, імя навучэнца, школа, клас). Работы па дадзенай намінацыі прымаюцца ў электронным выглядзе (працягам 2-3 хвіліны).

<u>Намінацыя</u>: выяўленчае мастацтва "Постаці слаўнага краю майго" #Пісьменнікі_Капыльшчыны.

Намінацыя ўключае адлюстраванне тэматыкі конкурсу ў малюнку. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі работ з'яўляюцца адпаведнасць тэме Конкурса, мастацкі або тэхнічны ўзровень выканання творчай працы, арыгінальнасць, культура афармлення. На працах абавязковыя саправаджальныя надпісы прозвішча і ініцыялаў аўтара і назвы працы.

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца прадстаўленыя ў тэрмін працы, змест якіх адпавядае зацверджаным намінацыям конкурсу паводле Палажэння.

Заяўкі на ўдзел разам з творчымі работамі адсылаць ці прыносіць да 1 верасня 2021 г. ў Капыльскую раённую цэнтральную бібліятэку імя А. Астрэйкі па адрасу: вул. Замкавая, 1а; e-mail: kopylbibl@mail.ru, тэлефон для даведак: 55-5-33, 54-7-85 (дадатак Заяўка (прыкладваецца).

## 4. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖВАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

4.1 Для падвядзення вынікаў конкурсу створана кампетэнтнае журы ў складзе:

- А.І.Пілат, дырэктар ДУК "Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі", старшыня журы;
- Т.А.Гняцько, загадчыца аддзелам бібліятэчнага маркетынгу, сакратар;
- І.А.Пятровіч, загадчыца аддзела абслугоўвання і інфармацыі;
- У.Б. Чаркас, дырэктар ДУК "Капыльская дзіцячая школа мастацтваў";
- М.А.Мароз, выкладчык дзіцячай школы мастацтваў

4.2 У кожнай намінацыі прызначаецца па 1 прызавому месцу ў кожнай узроставай групе:

- 1 група - удзельнікі ва ўзросце да 10 гадоў;
- 2 група – удзельнікі з 11 да 13 гадоў;
- 3 група – удзельнікі з 14 гадоў і больш.

Пераможцы атрымаюць дыпломы і памятныя падарункі.

4.3 Вынікі конкурсу будуць падведзены да 1 верасня 2021 года. Уручэнне дыпломаў і падзяк адбудзецца ў ДУК "Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі" 5 верасня 2021г. у час святкавання Дня беларускага пісьменства.

4.4 Арганізацыйным камітэтам могуць быць прадугледжаны спецыяльныя прызы ў рамках асобных намінацый конкурсу.

Аргкамітэт

ЗАЯЎКА

на ўдзел у раённым конкурсе творчых работ і малюнкаў “Малая радзіма вялікіх людзей”, прысвечаны Дню беларускага пісьменства

1. Прозвішча________________________________________________

2. Уласнае імя________________________________________________

3. Імя па бацьку _____________________________________________

4. Творчы калектыў _________________________________________

5. Дата наражэння_______________________________________________

6. Назва намінацыі _____________________________________________

7.Назва творчай работы_______________________________________

____________________________________________________________

8. Хатні адрас удзельніка конкурсу ________________________________

____________________________________________________________

9.Месца вучобы (работы) удзельніка конкурсу______________

____________________________________________________________

10.Тэлефон удзельніка конкурсу ________________________________

11.Электронны адрас удзельніка конкурсу______________________

_______________ (дата)